Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.Ю. Лозка, А.В. Дрыгін***

# Беларуская фальклярыстыка: НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ

**Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-02 02 03 Сусветная і айчынная культура. Рытміка. Харэаграфія;
1-02 02 04 Сусветная і айчынная культура. Фальклор**

Мінск 2012

Репозиторий БГПУ

УДК 394.3(075.8)
ББК 82я73
Л72

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э ц э н з е н т ы:
доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі вышэйшай школы і сучасных выхаваўчых тэхналогій БДПУ *В.А. Капранава*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ *І.М. Гоўзіч*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ *В.А. Вараб'ёва*

Лозка, А.Ю.
Л72 Беларуская фальклярыстыка: Народныя гульні : вучэб.-метад. дапам. / А.Ю. Лозка, А.В. Дрыгін. – Мінск : БДПУ, 2012. – 176 с.
ISBN 978-985-541-053-0.

У дапаможніку падаецца гісторыя і тэорыя народнай гульні, асаблівая ўвага звяртаецца на вывучэнне асноўных традыцыйных ігрышчаў, гульняў і забаў беларусаў і выкарыстанне іх як неацэннага сродку педагогікі ў адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці. Выданне працягвае серыю «Беларуская фалькларыстыка», у якой выйшлі дапаможнікі «Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія» (2009), «Традыцыйны тэатр» (2009), «Аказіянальная абраднасць і паэзія» (2010).

Адрасуецца выкладчыкам і студэнтам, настаўнікам і школьнікам, якія займаюцца вывучэннем вуснай народнай творчасці, шырокаму колу аматараў традыцыйнай культуры.

УДК 394.3(075.8)
ББК 82я73

ISBN 978-985-541-053-0

© Лозка А.Ю.,
Дрыгін А.В., 2012
© БДПУ, 2012

# УВОДЗІНЫ

Беларускі фальклор – гэта скарбніца духоўнай культуры нашай нацыі, выток розных відаў мастацтва і светапогляду народа. Народная творчасць уяўляе мнагажанравую сістэму, якая ўключае народныя песні, танцы, казкі, легенды і паданні, народныя апавяданні, павер'і, выслоўі і г. д.

Адным са старажытных, непаўторных, самабытных жанраў фальклору з'яўляецца народная гульня. Беларускі народ здаўна ведае шмат цікавых, захапляльных забаў, якія стагоддзямі перадаваліся з пакалення ў пакаленне як культурныя каштоўнасці. Па сённяшні дзень некаторыя звычаі, абрады, рытуалы, забабоны, якія ўжо даўно страцілі сваё першапачатковае магічнае значэнне, не зніклі ў колазвароце часу, а працягваюць сваё жыццё ў гульнёвай дзейнасці.

Народная гульня – сацыяльна-культурны феномен, у якім адбываецца ўмоўнае адлюстраванне рэчаіснасці. Варта адзначыць, што лепшыя ўзоры народнай фізічнай культуры, працоўнай дзейнасці, педагогікі, увасобленыя ў гульнях, ашчадна захоўваюцца, пераасэнсоўваюцца і набываюць новае значэнне.

Гульня мае велізарныя магчымасці ўплыву на асобу чалавека, станоўчы выхаваўчы і развіццёвы патэнцыял. Менавіта гэты фальклорна-этнаграфічны жанр спрыяе фарміраванню нацыянальнай свядомасці, развіццю фізічных і інтэлектуальных здольнасцей, пазнанню гісторыі, быту, народнай творчасці. Аднак у наш час народныя гульнёвыя традыцыі не ў поўнай ступені выкарыстоўваюцца ў розных сферах грамадскага і культурнага жыцця.

У вучэбна-выхаваўчым аспекце неабходна вылучаць два кірункі: адраджэнскі, які прадугледжвае зварот да забытага, уключэнне яго ў актыўную практыку, і навукова-даследчы, асновай якога з'яўляецца разгляд некаторых гульняў з пазіцыі вывучэння, пазнання гісторыі развіцця чалавека, набыцця навуковых ведаў і навыкаў. Злучэнне гэтых



Репозиторий БГПУ

двух кірункаў у даследаванні гульняў адкрывае перад студэнтамі і навукоўцамі шляхі да вывучэння іх генезісу.

Выданне «Народныя гульні» працягвае серыю «Беларуская фальклярыстыка», у якой выйшлі дапаможнікі «Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія» (2009), «Традыцыйны тэатр» (2009), «Аказіянальная абраднасць і паэзія» (2010). Яно можа быць выкарыстана студэнтамі тых спецыяльнасцей, дзе народныя гульні з'яўляюцца неад'емным і важным раздзелам, а таксама школьнікамі і навучэнцамі іншых адукацыйных устаноў на спецыяльных занятках, у пазаўрочнай і пазашкольнай дзейнасці.

У дапаможніку ўтрымліваецца як тэарэтычны, так і практычны матэрыял для паглыблення і замацавання ведаў, які можа стаць асновай ці дадаткам практычна-мастацкай дзейнасці.

Пад агульным аўтарствам падрыхтаваны «Уводзіны», «Сутнасць гульні і яе асноўныя паняцці». Анатолю Дрыгіну належаць глава «Выкарыстанне народных гульняў у фізічнай культуры і мастацкай творчасці» і падраздзел «Гульні з перавагай элементаў інтэрмедыі, харэаграфіі, імітацыі або з творчай выдумкай».



## Глава 1
# ГІСТОРЫЯ ЗБІРАННЯ І ВЫВУЧЭННЯ НАРОДНЫХ ГУЛЬНЯЎ

Важнай крыніцай звестак пра даўнасць народных гульняў з'яўляюцца матэрыялы археалагічных раскопак. Археолагі знаходзяць у старажытных пластах акрамя прылад працы яшчэ і прасцейшы гульнёвы матэрыял. «З дваццаці ўсходнеславянскіх гарадоў перыяду Кіеўскай Русі, у якіх знойдзена хоць адна шахматная фігурка, пятнаццаць размешчана ў межах сучаснай Беларусі, – заўважае даследчык С. Цярохін. – Найбольш старажытныя фігуркі паходзяць з Ваўкавыска, Копысі і з гарадзішча на Менцы (12 кіламетраў ад Мінска) і датуюцца XI стагоддзем». У іншых месцах часцей знаходзяць каменныя бразготкі, а таксама фігуркі людзей, жывёл, птушак, выраб якіх звязаны з вынаходніцтвам керамікі, а гэта часы неаліту.

Першыя збіральнікі беларускага фальклору менш увагі надавалі народным гульням, чым, напрыклад, песням. Аднак некаторыя тэксты гульнёвых карагодаў адным з першых зафіксаваў славяназнавец, адзін з пачынальнікаў беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі З. Даленга-Хадакоўскі.

У 1830 г. А.В. Мухлінскі надрукаваў у «Вестнике Европы» некаторыя свае назіранні над святамі, забавамі і абрадамі ў Навагрудскім павеце Літоўска-Гродзенскай губерні.

Першым найбольш значным даследаваннем польскіх і беларускіх гульняў з'яўляецца кніга польскага гісторыка, этнографа і архівіста Л. Галамбёўскага «Гульні і забавы розных саслоўяў ва ўсім краі або ў некаторых толькі правінцыях» (1831), у якой апісана 195 гульняў, на паперы, у карты, даміно і г. д., а таксама шмат абрадаў. На жаль, у сваёй рабоце этнограф не размяжоўвае польскія і бела-



Репозиторий БГПУ

мя таго, часта не мае сэнсу. Ён бывае дваякі: то вынімаецца з закрытай шапкі ўмоўны знак – параўнальна невялікі камень, палачка, саломінка, то вымаўляецца просты і рыфмаваны падбор слоў, пры гэтым «гадаючы» пры кожным слове паказвае па чарзе на асобнага гурткоўца, не выключаючы і сябе [ ... ].

1. Анцы – дванцы – трынцы – ярынцы – пятым – ладым – шуктым – буктым – дэвыр – дэкс! (у мове 10 слоў).

2. Кова – нова – чым – падкова – злата – літа – пыдкаліта – каю – вею – бом – заставайся дураком! (у мове 11 слоў).

3. Кулю – кулюкушкі – чатыры – лягушкі – пяты – кырнаты[1] – шосты – бязхвосты – сыбакі – дыгналі – хвост – адырвалі (у мове 12 слоў) [ ... ].

Маю права сцвярджаць, што сказаным пра тутэйшыя гульні і гульцоў зроблена не ўсё: мной пералічаны найбольш агульныя гульні, якія сустракаюцца часцей за іншыя [ ... ].

Зрабіўшы некаторыя вытрымкі грубых бакоў некаторых гульняў, у той жа час неабходна прызнаць, што яны адрозніваюцца ўсімі вартасцямі: утвараюць цела і душу, развіваюць рухавасць, лоўкасць, кемлівасць сярод празаічнага будняга жыцця, даюць тое, што неабходна для ўзнёслаўзбуджанага стану душы [ ... ].

Аўтару гэтых радкоў даводзілася бачыць у Віцебскім павеце як «няня-ляля» суцішала і заспакойвала даручаных ёй малалетак і дзеда, які дайшоў да крайняй ступені «дзяцінства» і з нядаўняга часу бавіўся дзіцячымі гульнямі (далей распавядаецца аб гульнях пра гусей і як «піпа кашку варыла». – *А.Л.*).

*Пераклад з рускай мовы А. Лозкі*

---

[1] Кырнаты (прым.) – абрэзаны, бязхвосты, без вушэй.



# ЗМЕСТ


Уводзіны ........ 3

*Глава 1.* Гісторыя збірання і вывучэння народных гульняў ........ 5

*Глава 2.* Сутнасць гульні і яе асноўныя паняцці ........ 10

*Глава 3.* Класіфікацыя народных гульняў ........ 19

3.1. Каляндарныя гульні ........ 25

Зімовыя гульні ........ 30

Веснавыя гульні ........ 56

Летнія гульні і забавы ........ 92

Восеньскія гульні ........ 96

Карагодныя і танцавальныя гульні ........ 106

3.2. Сямейна-абрадавыя гульні ........ 110

Радзінныя гульні і забавы ........ 110

Вясельныя гульні ........ 112

3.3. Гульні, не звязаныя з календаром і абрадамі. ........ 118

Гульні з інвентаром ........ 118

Гульні без інвентару ........ 123

*Глава 4.* Выкарыстанне народных гульняў у фізічнай культуры і мастацкай творчасці ........ 131

Літаратура ........ 150

Дадатак 1 ........ 153

Мікалай Нікіфароўскі – даследчык народнай гульні ........ 153

Дадатак 2 ........ 163

Гульні і гульцы ........ 163

Дзяцінныя бавы ........ 163

Бавы падлеткаў ........ 167

Бавы моладзі ........ 169

Бавы сталых і пажылых асоб ........ 171

Некалькі слоў пра сумесныя гульні ........ 172

Жараб'ёвая частка ........ 173




Рэпазіторый БДПУ

Вучэбнае выданне

**Лозка Аляксандр Юр'евіч**
**Дрыгін Анатоль Віктаравіч**

# Беларуская фалькларыстыка: НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

**Выдаецца ў аўтарскай рэдакцыі**

**Якасць ілюстрацый адпавядае якасці прадстаўленых арыгіналаў**

*Карэктар* Н.С. Касякова
*Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка* І.І. Драздовай
*Дызайн вокладкі* А.А. Пакалы

Падпісана ў друк 25.02.12. Фармат 60 x 84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура *Школьная*. Друк Riso. Ум. друк. арк. 10,23.
Ул.-выд. арк. 8,79. Тыраж 320 экз. Заказ 79

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
ЛИ № 02330/0494368 ад 16.03.09.
ЛП № 02330/0494171 ад 03.04.09.
Савецкая, 18, 220030, Мінск.
http://izdat.bspu.unibel.by/

Репозиторий БГПУ